Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 10. Варыянт 5**

## Білет 10. Практычнае заданне. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа.

**Распрацоўнікі заданняў:**
Сілкова Кацярына Пятроўна, ДУА "Сярэдняя школа № 3 г.Клімавічы"
Лявонава Таццяна Пятроўна, ДУА "Сярэдняя школа № 3 г.Клімавічы"
Філіпенка Наталля Мікалаеўна, ДУА "Сярэдняя школа № 1 г.Клімавічы"
Казлова Наталля Анатольеўна, ДУА «Палашкаўская сярэдняя школа Клімавіцкага раёна»
Родзькіна Таццяна Андрэеўна, ДУА «Сярэдняя школа № 1 г.Клімавічы»
Бруеў Сяргей Барысавіч, ДУА «Сярэдняя школа № 1 г.Клімавічы»
Ларыёнаў Вячаслаў Анатольевіч, ДУА «Ціманаўская сярэдняя школа Клімавіцкага раёна»

**Адкажы на прадстаўленыя пытанні:**

1. З апорай на крыніцу №2 (фота) назавіце мемарыяльны комплекс, сімвалам якога з'яўляецца дадзеная скульптурная кампазіцыя? (2 узровень)
2. З апорай на крыніцу № 1(літаратурны тэст) і крыніцу №2 (фота) якая трагедыя адбылася ў вёсцы Хатынь 22 сакавіка 1943 года? Хто такі Іосіф Камінскі? (3 ўзровень)
3. З апорай на крыніцу №1 , №2 і №3вызначыце, якія ваенныя падраздзяленні здзейснілі карную аперацыю? Раскрыйце сэнс праводзімай палітыкі супраць мясцовага насельніцтва ў рамках рэалізацыі плана "Ост"? (4 ўзровень)
4. Растлумачце, сімвалам чаго стала трагедыя Хатыні ў памяці беларускага народа? (5 ўзровень)

**Крыніца № 1**
https://www.gstu.by/youth-policy/education/hatyn-simvol-vechnoy-pamyati-i-skorbi-belorusskogo-naroda-k-75-letiyu-tragedii *літаратурная крыніца*

22 сакавіка 1943 года на шашы Мінск-Віцебск за шэсць кіламетраў ад Хатыні каля вёскі Казыры партызаны абстралялі аўтакалону фашыстаў у складзе адной легкавой і дзвюх грузавых машын. У выніку абстрэлу быў забіты афіцэр паліцыі шэф-камандзір 1-й роты 118 паліцэйскага батальёна гаўптман Вельке і трое паліцэйскіх. Партызаны, якія здзейснілі напад, схаваліся ад фашыстаў у лесе, якія пераследвалі іх.

У другой палове дня, выклікаўшы падмацаванне з Лагойска, дзе дыслакаваўся батальён СС Дзірлевангера, карапаліцэйскага батальёна накіраваліся ў найбліжэйшую вёску Хатынь.

Азвярэлыя фашысты ўварваліся ў вёску і атачылі яе. Людзі яшчэ нічога не ведалі, але ім ужо быў вынесены смяротны прысуд. Жыхароў вёскі ад малога да вялікага - старых, жанчын, дзяцей выганялі з дамоў і гналі ў калгасную адрыну. Прыкладамі аўтаматаў паднімалі з пасцелі хворых, старых, не літавалі жанчын з маленькімі і груднымі дзецьмі.

Абгарэлых, параненых дзяцей падабралі і выходзілі жыхары суседніх вёсак. Пасля вайны дзеці выхоўваліся ў дзіцячым доме.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Дарослы сведка хатынскай трагедыі 56-гадовы вясковы каваль Іосіф Камінскі, абгарэлы і паранены, апрытомнеў позна ноччу, калі фашыстаў ужо не было ў вёсцы. Яму прыйшлося перажыць яшчэ адзін цяжкі ўдар: сярод трупаў аднавяскоўцаў ён знайшоў свайго параненага сына. Хлопчык быў смяротна паранены ў жывот, атрымаў моцныя апёкі. Ён памёр на руках у бацькі.

**Крыніца № 2**

*Гэты трагічны момант з жыцця Іосіфа Камінскага пакладзены ў аснову стварэння адзінай скульптуры мемарыяльнага комплексу "Хатынь" - "Непакорны чалавек".*



**Крыніца № 3**

*Па матэрыялах БелТа*



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Адказы:1.скульптура мемарыяльнага комплексу "Хатынь" - "Непакорны чалавек".
2. 22 сакавіка 1943 года вёска была спалена разам з яе жыхарамі.Дарослы сведка хатынскай трагедыі 56-гадовы вясковы каваль Іосіф Камінскі, абгарэлы і паранены, апрытомнеў позна ноччу, калі фашыстаў ужо не было ў вёсцы. Яму прыйшлося перажыць яшчэ адзін цяжкі ўдар: сярод трупаў аднавяскоўцаў ён знайшоў свайго параненага сына. Хлопчык быў смяротна паранены ў жывот, атрымаў моцныя апёкі. Ён памёр на руках у бацькі.
3. У карнай аперацыі ў вёсцы Хатынь 22 сакавіка 1943 года бралі ўдзел1-я рота 118 паліцэйскага батальёна, батальён СС Дзірлевангера. Прыведзеныя факты - толькі некаторая частка прыкладаў, якія бачна і пераканаўча ілюструюць бесчалавечную сутнасць мэтанакіраванай палітыкі знішчэння не заваяванай акупантам беларускай нацыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
Для насаджэння новага парадку акупанты абралі палітыку генацыду. Гісторыя вёсак Хатынь, Ола, Боркі, існаванне лагераў смерці, гета, месцаў прымусовага ўтрымання, правядзенне карных аперацый, мноства іншых прыкладаў масавага крывавага тэрору таму пацвярджэнне.
4.Лёс Хатыні падзялілі многія населеныя пункты Беларусі. У вёсцы Боркі Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ёсць помнік спаленым вёскам Магілёўшчыны. На Клімаўшчыне было спалена 25 вёсак. Вёскі Набат і Карпачы не адноўлены